*А. М. Мох*
Акадэмія адукацыі, Мінск

*E. Mokh*
Academy of Education

**УДК 37.091.12.(476) «1960»**

# РЭСПУБЛІКАНСКІ З'ЕЗД НАСТАЎНІКАЎ У БССР: ПРАКТЫЧНАЕ ПРЫМЯНЕННЕ ЗАКОНА «АБ УМАЦАВАННІ СУВЯЗІ ШКОЛЫ З ЖЫЦЦЁМ», 1960

# REPUBLICAN CONGRESS OF TEACHERS IN THE BSSR: PRACTICAL IMPLEMENTATION OF THE LAW "ON STRENGTHENING THE CONNECTION OF SCHOOL WITH LIFE", 1960

*Артыкул прысвечаны з'езду настаўнікаў, што адбыўся ў 1960 г. у Мінску. Тады ў абмеркаванні важнейшых пытанняў развіцця школьнай адукацыі прынялі ўдзел лепшыя прадстаўнікі прафесіі з усёй БССР. Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца разгляд вынікаў работы школ пасля прыняцця закона «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём».*
*Ключавыя словы: настаўніцкі з'езд; дэлегаты з'езда; навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу; абмен вопытам.*

*The article is dedicated to the 1960 teachers' congress in Minsk. The best teachers of the BSSR took part in it to discuss important issues of school education development. The aim of this study is to examine the results of school work after the adoption of the law «On Strengthening the Connection between School and Life».*
*Keywords: teachers' congress; congress delegates; scientific and methodological support of the educational process; exchange of experience.*

Поспех усёй школьнай справы забяспечвае настаўнік. Настаўнік – цэнтральная фігура вучэбна-выхаваўчага працэсу. Ён аддае ўсе свае сілы, талент, уменні высакароднай справе – выхаванню дзяцей, – праводзіць іх у цудоўны свет ведаў. Для паспяховага развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі, вызначэння асноўных напрамкаў работы і пастаноўкі задач перад сучаснай школай узнікае неабходнасць у гістарычным абгрунтаванні стратэгіі школьнай адукацыі. У сувязі з гэтым цікавасць уяўляе арганізаваная прафесійная камунікацыя беларускага настаўніцтва – з'езд у 1960 г.

Перад кожным настаўнікам і работнікам асветы ўзнікалі пытанні наконт таго, як лепш ажыццявіць перабудову ў сістэме школьнай адукацыі і ўдасканаліць адукацыйны працэс. Магчымасць абмеркаваць гэтыя праблемы з'явілася: 11–13 жніўня 1960 г. у Мінску прайшоў з'езд настаўнікаў БССР і стаў важнай падзеяй у жыцці педагагічнай суполкі. Агульная колькасць дэлегатаў і гасцей з'езда налічвала 1200 чалавек. На мерапрыемства запрашаліся прадстаўнікі Міністэрства асветы вышэйшай школы, навуковых устаноў і Акадэміі педагагічных навук РСФСР, ЦК прафсаюзаў. На пра-

вядзенне з’езда, арганізацыю прыёму гасцей з саюзных рэспублік і заслужаных настаўнікаў БССР Міністэрству асветы было выдаткавана 7,5 тысяч рублёў [1, л. 1–2].

У чэрвені 1960 г. Міністр асветы БССР І. М. Ільюшын зацвердзіў план мерапрыемстваў Міністэрства асветы БССР па правядзенні з’езда, які прадугледжваў падрыхтоўку матэрыялаў (тэксту даклада Міністра адукацыі «Перабудова школы і задачы настаўніцтва»); камандзіроўкі супрацоўнікаў міністэрства ў школы і дашкольныя ўстановы БССР з мэтай вывучэння работы на месцах і збору матэрыялаў; арганізацыю выставы «Народная адукацыя ў БССР»; падрыхтоўку матэрыялаў аб прысваенні настаўнікам і работнікам асветы ганаровага звання «Заслужаны настаўнік школы БССР» і прадстаўленне іх у ЦК КПБ [2, л. 11–12].

Асноўнай задачай з’езда было абмеркаванне першых вынікаў работы школ пасля прыняцця закона «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём». Згодна з законам «галоўнай задачай савецкай школы з’яўлялася падрыхтоўка навучэнцаў да жыцця, грамадска карыснай працы, далейшае павышэнне ўзроўню агульнай і політэхнічнай адукацыі, падрыхтоўка адукаваных людзей, якія добра ведаюць асновы навук, выхаванне моладзі ў духу глыбокай павагі да прынцыпаў сацыялістычнага грамадства, у духу ідэй камунізму» [3, с. 55–57].

У рабоце з’езда прымалі ўдзел лепшыя настаўнікі, выхавальнікі школ-інтэрнатаў, дзіцячых дамоў, старшыя піянерважатыя, работнікі народнай асветы, прадстаўнікі грамадскасці – кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, партыйныя, прафсаюзныя і савецкія работнікі. Колькасны састаў дэлегатаў і ўдзельнікаў з’езда ўключаў 177 чалавек з Брэсцкай вобласці, 179 – з Віцебскай, 178 – з Гомельскай, 126 – з Гродзенскай, 195 – з Мінскай, 144 – з Магілеўскай, 106 – з г. Мінска. Госці з саюзных рэспублік налічвалі 43 чалавекі.

З агульнай колькасці дэлегатаў настаўнікаў і кіраўнікоў усіх тыпаў школ было 700 чалавек, работнікаў раённых, гарадскіх і абласных аддзелаў народнай асветы – 232, старшых піянерважатых – 21, кіруючых работнікаў партыйных, савецкіх і камсамольскіх арганізацый – 89.

Даныя аб узросце і стажы работы дэлегатаў з’езда сведчаць, што ў мерапрыемстве прымалі ўдзел як маладыя, так і вопытныя настаўнікі. Так, ва ўзросце да 40 гадоў было 44 % педагогаў; 40–50 – 36 %, вышэй за 50 гадоў – 20 %. Па працоўным стажы да 5 гадоў – 44 чалавекі, 5–25 гадоў – 775, больш за 25 гадоў – 213. Вышэйшую і няскончаную вышэйшую адукацыю мелі 878 дэлегатаў, сярэднюю – 154 [4, л. 86–89].

641 дэлегат – члены і кандыдаты ў члены Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, 78 членаў ВЛКСМ, 323 беспартыйныя. Ад агульнай колькасці ўдзельнікаў з’езда 45 % складалі жанчыны. Па нацыянальным складзе беларусаў было 821 чалавек, рускіх – 155, яўрэяў – 39, украінцаў – 16

і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей – 11. Сярод дэлегатаў – 58 заслужаных настаўнікаў школы БССР, 418 – уладальнікі ордэнаў і медалёў, 236 чалавек узнагароджаныя значком «Выдатнік народнай асветы». У складзе дэлегатаў – тры дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, 423 дэпутаты абласных, гарадскіх, раённых, сельскіх і пасялковых Саветаў [5].

11 жніўня 1960 г. Рэспубліканскі з'езд настаўнікаў урачыста адкрыла загадчыца вучэбнай часткі сярэдняй школы № 48 г. Мінска, заслужаная настаўніца БССР С. Я. Сычоўская. Прапанову аб колькасным і персанальным саставе ганаровага прэзідыума з'езда ўнёс загадчык Мінскага абласнога аддзела народнай адукацыі К. Ф. Коршук, аб саставе мандатнай камісіі з'езда – дырэктар школы № 10 г. Слуцка, заслужаны настаўнік школы БССР С. Ф. Рубанаў [5, л. 36].

Дэлегаты ў сваю чаргу выбралі кіруючыя органы з'езда: прэзідыум, сакратарыят, рэдакцыйную і мандатную камісіі. Сакратар ЦК КПБ В. Ф. Шаура зачытаў прывітальнае слова Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і Савета Міністраў БССР Рэспубліканскаму з'езду настаўнікаў і ўсім работнікам народнай асветы БССР: «…Поспех у рабоце ў многім залежыць ад умення ўлічыць і выкарыстаць вопыт лепшых школ і настаўнікаў. Збіраць крупінкі перадавога педагагічнага вопыту, вывучаць і абагульняць, рабіць яго здабыткам кожнага настаўніка – найпершы абавязак кіраўнікоў школ і органаў народнай асветы. Настаўнікі павінны сістэматычна павышаць свой ідэйна-тэарэтычны ўзровень, няспынна ўдасканальваць педагагічнае майстэрства, змагацца за паспяховае выкананне закона "Аб умацаванні сувязі школы з жыццём" і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі» [6, с. 1–2].

У парадак пасяджэння было ўключана два пытанні: даклад Міністра асветы БССР І. М. Ільюшына «Перабудова школы і задачы настаўніцтва» і даклад сакратара ЦК ЛКСМБ Л. Г. Максімава «Камсамол і школа».

Цэнтральнае месца ў гэтых дакладах, а таксама ў выступленнях дэлегатаў займала, натуральна, праблема спалучэння навучання з прадукцыйнай працай.

Як адзначалася ў дакладзе Міністра асветы БССР І. М. Ільюшына, у 1959/1960 навучальным годзе ў БССР працавала 11 570 агульнаадукацыйных школ, у якіх навучалася 1219,8 тысячы вучняў. Былі створаны школы-інтэрнаты, у якіх выхоўвалася 8500 дзяцей. Праводзілася маштабная работа па навучанні дарослых без адрыву ад вытворчасці. Для параўнання: у 1958/1959 навучальным годзе ў 1114 школах і асобных класах навучалася 73 059 чалавек.

За пасляваенныя гады ў школах рабочай і сельскай моладзі, завочных школах адукацыю за VII класаў атрымалі 82 073 чалавекі; за сярэднюю школу – 70 285. Асаблівае месца ў выхаванні вучняў, развіцці іх здольнасцей належала пазашкольным установам. У БССР працавала больш

за 90 дамоў і палацаў піянераў, 13 станцый юных тэхнікаў, 59 спартыўных школ, 8 дзіцячых экскурсійна-турысцкіх станцый, тэатр юнага гледача, 167 дзіцячых бібліятэк [7, с. 3–4].

Закон «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў БССР» паставіў перад школай важныя задачы і праблемы: павышэнне ўзроўню агульнай і політэхнічнай адукацыі, пераход ад абавязковага сямігадовага навучання да ўсеагульнага абавязковага васьмігадовага. Вырашэнне гэтых задач патрабавала сумеснай работы школ, органаў Міністэрства адукацыі з прадпрыемствамі, калгасамі, саўгасамі і іншымі ўстановамі.

У выніку пераводу сямігадовых школ у васьмігадовыя навучэнцы пачалі атрымліваць больш высокую тэарэтычную і практычную падрыхтоўку. Гэта плённа адбілася на ўцягненні моладзі ў грамадска карысную працу і павышэнні ўзроўню адукацыі. Так, у 1959/1960 навучальным годзе 133 сямігадовыя школы былі пераведзены на васьмігадовы тэрмін навучання. Планавалася, што ўжо ў 1962/1963 навучальным годзе ўсе вучні VII класаў абавязкова пяройдуць у восьмы клас і скончаць васьмігадовую школу.

Пераход на ўсеагульнае абавязковае васьмігадовае навучанне патрабаваў стварэння неабходнай вучэбна-матэрыяльнай базы, уліку вопыту перадавых раёнаў, гарадоў, дзе паспяхова ажыццяўлялася школьнае будаўніцтва, умела выкарыстоўваліся бюджэтныя асігнаванні, прыцягвалася грамадскасць да стварэння школ, вучэбных майстэрняў, кабінетаў. Асноўнымі задачамі з'яўляліся перавод школ на адназменныя заняткі, арганізацыя гарачага харчавання і падвозу школьнікаў. Так, напрыклад, у Асіповіцкім раёне на адназменныя заняткі перайшлі 48 з 52 пачатковых школ і 50 % сямігадовых школ. У Мсціслаўскім раёне з 77 пачатковых школ 73 працавалі ў адну змену. Вялікая работа ў гэтым кірунку праводзілася ў Рагачоўскім, Віцебскім, Ваўкавыскім і многіх іншых раёнах.

Як было сказана ў законе, галоўнымі задачамі школы з'яўляліся падрыхтоўка вучняў да жыцця, грамадска карыснай працы, выхаванне моладзі ў духу глыбокай павагі да прынцыпаў сацыялістычнага грамадства, ідэй камунізму. Так, поўная сярэдняя адукацыя моладзі, пачынаючы з 15–16-гадовага ўзросту, ажыццяўлялася на аснове спалучэння навучання з працай. У 1959/1960 навучальным годзе I–V класы ўсіх школ БССР і IX класы 260 сярэдніх школ былі пераведзены на новы вучэбны план і новыя праграмы, якія прадугледжвалі больш высокі ўзровень агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі вучняў, правільныя суадносіны агульнай, прафесіянальнай і політэхнічнай адукацыі. Больш увагі надавалася правядзенню лабараторных і практычных заняткаў, экскурсій, самастойных работ вучняў, выкарыстанню наглядных дапаможнікаў.

Многія школы, у якіх было ўведзена вытворчае навучанне, добра спраўляліся з пастаўленымі задачамі. Сярод такіх устаноў былі школы № 50 г. Мінска, № 7 і 11 г. Магілёва, № 1 г. Гродна, № 10 г. Слуцка і інш. У сельскай мясцовасці ствараліся вучнёўскія вытворчыя брыгады ў калгасах і саўгасах.

Задачай кожнага настаўніка было навучанне глыбокім і трывалым ведам асноў навук, творчаму выкарыстанню эфектыўных прыёмаў і метадаў работы. Пры гэтым трэба было разумець, што ўсе вучэбныя прадметы – важныя, узаемна дапаўняюць адзін аднаго і складаюць адзіную цэласную сістэму ўсебаковай падрыхтоўкі і развіцця падрастаючага пакалення.

Педагагічныя калектывы (з улікам канкрэтных умоў) павінны былі прадумваць арганізацыю працоўнай падрыхтоўкі так, каб яна прадугледжвала ўключэнне дзяцей у пасільную і разнастайную практычную дзейнасць, накіраваную на злучэнне разумовай працы з фізічнай. Падчас навучання школьнікаў агульнаадукацыйным прадметам у працоўнай і прафесіянальнай падрыхтоўцы неабходна было паслядоўна ўкараняць прынцып політэхнізму. У працэсе выкладання агульнаадукацыйных дысцыплін, асабліва такіх, як фізіка, хімія, біялогія, матэматыка, чарчэнне, настаўнік павінен быў на канкрэтных фактах і прыкладах паказаць вучням, як законы навукі выкарыстоўваюцца ў жыцці, працы і побыце людзей.

Заслугоўваў вопыт арганізацыі вытворчага навучання сярэдняй школы № 11 г. Магілёва на базе завода штучнага валакна. У школы і завода на тыя часы склаліся добрыя дзелавыя стасункі ў вырашэнні пытанняў падрыхтоўкі вучняў да практычнай дзейнасці. Кіраўніцтва і пярвічныя грамадскія арганізацыі прадпрыемства прымалі актыўны ўдзел у рабоце ўстановы адукацыі, дапамагалі з абсталяваннем вучэбных кабінетаў і майстэрань. Педагагічныя саветы, нарады і іншыя мерапрыемствы школа праводзілі з удзелам прадстаўнікоў завода. У сваю чаргу дырэкцыя і настаўнікі школы ўдзельнічалі у тэхнічных і вытворчых нарадах на заводзе.

Сярод сельскіх школ значных поспехаў у акрэсленым кірунку дасягнуў педагагічны калектыў Гарадзейскай школы Нясвіжскага раёна, які ўзначальвае ініцыятыўны кіраўнік Сцяпан Адамавіч Крэмез. Тут некалькі гадоў шукалі найбольш рацыянальныя шляхі сувязі школы з жыццём, падрыхтоўкі выпускнікоў да практычнай дзейнасці. Ужо чацвёрты год усе выпускнікі школы разам з атэстатам сталасці атрымлівалі адпаведнае пасведчанне аб прысваенні ім працоўнай спецыяльнасці. Так, летась 21 выпускнік атрымаў спецыяльнасць трактарыста, 12 выпускнікоў – камбайнера, 23 – электраманцёра, 12 – швачкі.

На з’ездзе абмяркоўваліся пытанні паляпшэння эстэтычнага, фізічнага выхавання школьнікаў, далейшага развіцця ў школах спартыўна-масавай работы, правядзення турысцкіх паходаў, масавых забаў, гульняў і іншых мерапрыемстваў.

У прамовах многіх дэлегатаў адчувалася трывога з-за нявырашанага пытання аб вытворчай падрыхтоўцы вучняў, планавання яе па спецыяльнасцях і галінах вытворчасці. Былі сур'ёзныя недахопы ў развіцці школ-інтэрнатаў. Некаторыя з іх адкрываліся непрадумана, без адпаведнай матэрыяльнай базы. Абласныя аддзелы народнай асветы дапускалі недахопы ў камплектаванні школ-інтэрнатаў педагагічнымі кадрамі – далёка не ўсе яны былі забяспечаны вопытнымі спецыялістамі. Дэлегаты ўказвалі і на тое, што ў рэспубліцы да сённяшняга дня не вырашана праблема забеспячэння школ кваліфікаванымі выкладчыкамі замежных моў, спеваў, музыкі, фізічнай культуры, асноў вытворчасці і працы.

У выхаванні дзяцей важная роля належыць мастацкай літаратуры, перыядычнаму друку, радыёвяшчанню, кіно, тэатру, выяўленчаму мастацтву. Вось чаму дэлегаты прад'яўлялі сур'ёзныя патрабаванні да работнікаў гэтых галін культуры, крытыкавалі недахопы ў іх рабоце.

Згодна з законам аб школе асноўным шляхам атрымання сярэдняй адукацыі працуючай моладдзю з'яўлялася вячэрняе (пазменнае) навучанне. Каб стварыць умовы, неабходныя для вучобы рабочай і сельскай моладзі, дзяржава давала ёй шэраг ільгот. Гэта, а таксама пераход на 7- і 6-гадзінны рабочы дзень, садзейнічала значнаму прытоку юнакоў і дзяўчат у вячэрнія (зменныя) школы. На бягучае сямігоддзе прадугледжвалася значнае пашырэнне сеткі вячэрніх (зменных) і завочных школ. Да 1965 г. яна павялічылася ў 1,5 разы, а колькасць вучняў узрасла да 145 тысяч чалавек, гэта значыць больш чым у 2 разы.

Многія вячэрнія (зменныя) школы паспяхова спраўляліся са сваімі задачамі. Станоўчым прыкладам была вячэрняя школа № 19 г. Мінска, якая будавала сваю работу ў цесным супрацоўніцтве з мотавелазаводам.

Сур'ёзную ўвагу дэлегаты звярталі на ўкамплектаванне вячэрніх (зменных) і завочных школ вопытнымі педагагічнымі кадрамі, якія павінны былі арганізоўваць работу па павышэнні ідэйна-тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню, абагульненні і пашырэнні перадавога вопыту.

Такім чынам, настаўніцкі з'езд выконваў важную прафесійную функцыю: абмен перадавым педагагічным вопытам, фарміраванне навукова-педагагічнай свядомасці і светапогляду навучэнцаў, павышаў эфектыўнасць выхаваўчай работы, накіраванай на станаўлення чалавека – творцы і носьбіта духоўнасці, патрыёта і грамадзяніна [8, с. 1].

Заўважым, што эфектыўнасць такіх форумаў залежыць ад актыўнасці настаўнікаў, магчымасці рэалізаваць творчыя ідэі, абагульніць вопыт работы педагогаў-наватараў і ўкараніць яго ў практыку сістэмы школьнай адукацыі.

**Спіс выкарастаных крыніц**

1. Пастанова Старшыні Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёва «Аб правядзенні Рэспубліканскага з'езда настаўнікаў» у 1960 г. // НАРБ. – Ф. 42. Воп. 5. Д. 770. Л. 1–2.
2. План мерапрыемстваў Міністэрства асветы БССР па правядзенні Рэспубліканскага з'езда настаўнікаў у 1960 г. // НАРБ. – Ф. 42. Воп. 5. Д. 770. Л. 11–12.
3. Народное образование в СССР. Общеобразовательная школа: сборник документов 1917–1973 гг. / сост.: А. А. Абакумов, Н. П. Кузин, Ф. И. Пузырев, Л. Ф. Литвинов. – Москва: Педагогика, 1974. – 560 с.
4. Даклад Старшыні мандатнай камісіі // НАРБ. – Ф. 42. Воп. 5. Д. 770. Л. 86–89.
5. Праграма працы з'езда // НАРБ. – Ф. 42. Воп. 5. Д. 770. Л. 36.
6. З'езду настаўнікаў БССР. Прывітальнае слова Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, Савета Міністраў БССР// Народная асвета. – 1960. – № 7. – С. 1–2.
7. *Ільюшын, І. М.* Насустрач з'езду настаўнікаў / І. М. Ільюшын // Народная асвета. – 1960. – № 7. – С. 3–7.
8. З'езд настаўнікаў БССР (дзённік з'езда) // Настаўніцкая газета. – 13 жніўня. – № 68. – С. 1.

**(Дата падачы: 27.02.2025 г.)**

*Е. П. Нарижная*
Республиканский институт высшей школы

*H. P. Narizhnaya*
National Institute for Higher Education

**УДК 712.3(476):551.5”17”**

# РЕЦЕПЦИЯ САДОВЫХ СТИЛЕЙ И КЛИМАТИЧЕСКИЕ ПЕРЕМЕНЫ ПО МАТЕРИАЛАМ МЕСТНЫХ ЛЕТОПИСЕЙ XVII – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЫ XVIII В.

# RECEPTION OF GARDEN STYLES AND CLIMATE CHANGE BASED ON LOCAL CHRONICLES FROM THE 17TH TO FIRST HALF OF THE 18TH CENT.

*В статье рассматривается значимость изучения предпосылок развития садово-парковых стилей ренессанса и барокко в XVI–XVIII вв. на белорусских землях с акцентом на влияние погодных условий на формирование ландшафтного икусства. Сделана попытка реконструкции изменчивого климата XVII в. по материалам местных летописей и хроник (Баркулабовская, Могилевская, Витебская), донесших яркие описания сезонных*